# АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ ЗЕМСКІХ НАЧАЛЬНІКАЎ ПА РЭГУЛЯВАННІ СЯЛЯНСКАГА ПЕРАСЯЛЕННЯ (на прыкладзе Мінскай губерні)

**Г. А. Страленя**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, stralenia@bsu.by*

У артыкуле разглядаецца дзейнасць земскіх начальнікаў па рэгуляванні пытанняў перасялення сялян у іншыя рэгіёны Расійскай імперыі, выдзелены асноўныя асноўныя напрамкі работы ў гэтай галіне.

***Ключавыя словы:*** земскія начальнікі; адміністрацыйныя і судовыя ўстановы; беларускія губерні; сялянскае перасяленне.

# ОСНОВНЫЕ НАПРАВЛЕНИЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ЗЕМСКИХ НАЧАЛЬНИКОВ ПО РЕГУЛИРОВАНИЮ КРЕСТЬЯНСКОГО ПЕРЕСЕЛЕНИЯ (на примере Минской губернии)

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, stralenia@bsu.by*

В статье рассматривается деятельность земских начальников по регулированию вопросов переселения крестьян в другие регионы Российской империи, выделены основные направления их работы в этой области.

***Ключевые слова:*** земские начальники; административно-судебные учреждения; белорусские губернии; крестьянское переселение.

# MAIN ACTIVITIES OF DISTRICT CAPTAINS IN REGULATION OF PEASANT RELOCATION (on the example of Minsk province)

**H. Stralenia**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, stralenia@bsu.by*

This article examines the activities of district captains in regulating peasant resettlement to other regions of the Russian Empire, highlighting the main areas of their work in this area.

***Keywords:*** district captains; administrative and judicial institutions; Belarusian provinces; peasant resettlement.

Урад Расійскай імперыі рэгуляваў сялянскую міграцыю, якая была выклікана як эканамічнымі прычынамі, так і адыходам ад традыцыйных норм паводзін [1, с. 100]. Па прычыне росту імкнення сялян беларускіх губерняў да перасялення на слабазаселеныя землі Сібіры, на земскіх начальнікаў былі ўскладзены дадатковыя абавязкі ў гэтым кірунку.

Мясцовым органам улады неабходна было сачыць, каб дазволы на перасяленне атрымалі сем'і, якія мелі для гэтага дастаткова сродкаў і магчымасцяў. Акрамя таго, земскія начальнікі павінны былі тлумачыць сялянам, якія былі маюць намер з'ехаць, што ў гэтым выпадку яны пазбаўляюцца правоў на долю ва ўчастку, які пераходзіў астатняй часткі сям'і. Калі селянін ужо пабываў у Сібіры, але так і не замацаваў за сабой участак, паўторнае прахадное пасведчанне павінна выдавацца яму ў выключных выпадках.

У дакладзе чыноўніка асобых даручэнняў Перасяленчага ўпраўлення Міністэрства ўнутраных спраў Д. Г. Разаліён-Сашальскага ад 5 мая 1898 г. адзначалася, што асноўнай мэтай урадовай палітыкі по рэгуляванні сялянскіх міграцый ў Сібір, з’яўляецца засяленне свабодных абшараў здольнымі да гэтага людзьмі без значных выдаткаў з боку дзяржавы [2, арк. 5]. У гэтай сувязі мясцовыя ўлады павінны былі сачыць, каб дазволы на пераезд атрымалі сем’і, якія валодалі добрай гаспадаркай і не мелі патрэбы ў неадкладнай урадавай дапамозе. У першую чаргу варта было звяртаць увагу на суадносіны працоўных рук да агульнай колькасці членаў сям’і [2, арк. 5]. Да прыкладу, сяляне Рэчыцкага павета Мінскай губерні ў 1900 г. звярнуліся ў Мінскую губернскую па сялянскіх справах прысутнасць з хадайніцтвам аб дазволе перасялення на казённыя землі ў Сібір. Абавязковы член Рэчыцкай павятовай па сялянскіх справах прысутнасці П. Глінка ад 17 сакавіка 1900 г. прадаставіў звесткі аб маёмасным і сямейным становішчы сялян. На паседжанні прысутнасці ад 9 чэрвеня 1900 г. пастанавілі, што толькі частка сем'яў (сям'і Роберта Асецкага, Паўла Крукоўскага, Канстанціна Савіцкага, Купрыяна Маеўскага, Герасіма Куніцкага і Сцяпана Янавіча) маюць магчымасць перасяліцца ў Сібір па сваім сямейным і маёмасным становішчы паводле цыркуляра МУС ад 20 студзеня 1897 г. Ім дазволілі пасылку хадакоў-упаўнаважаных ад сваіх сямействаў для замацавання за сем’ямі ў Сібіры участкаў казённай зямлі пад пасяленне. Астатнім сялянам у хадайніцтве аб пасылцы хадакоў было вырашана адмовіць па прычыне таго, што сем'і Сямёна Асецкага, Андрэя Багдана, Карпа Маеўскага і Франца Іваноўскага не забяспечаны дастатковай колькасцю працоўных рук [3, арк. 77]. Напрыклад, Канстанціну Савіцкаму, які атрымаў дазвол на адпраўку хадакоў, было 30 гадоў, яго жонцы Караліне — 28 гадоў, сынам Осіпу і Андрэю — 7 гадоў і 3 гады, дачцы Паўліне — 5 гадоў. У склад сям'і ўваходзіў брат Франц — 25 гадоў, яго жонка Дарыя — 22 гады, а таксама бацька Баніфат, якому было 58 гадоў. Сям'я арандавала зямлю ва ўладальніка графа Зубава і плаціла ў год па 40 руб. за 20 дзесяцін. Маёмасць ацанілі ў 390 руб. (3 кані — 80 руб., 2 валы — 50 руб., 6 кароў — 120 руб., 4 быкі — 80 руб., 4 цяляты — 40 руб., 5 авечак — 10 руб., 3 свіні — 10 руб.). Сям'я таксама займалася дадатковымі заробкамі, якія

прыносілі ім ад 40 да 60 руб. прыбытку. Пры разглядзе прашэння сям'і Савіцкіх было адзначана «дазволіць з прычыны дастатковай колькасці грашовых сродкаў і працоўных рук» [3, арк. 84]. Сям'я Андрэя Багдана, якому было 40 гадоў, якая таксама мела дадатковы заробак па нарыхтоўцы лясных матэрыялаў, атрымала адмову «з прычыны недастатковай колькасці працоўных рук». Андрэй і яго жонка Ганна выхоўвалі 6 дзяцей, старэйшай дачцы Феадоры было 15 гадоў, а малодшаму Філіпу — 2 гады. Маёмасць сям'і ацанілі ў 300 руб. [3, арк. 85].

Пасля ўвядзення пасады земскіх начальнікаў збор звестак аб перасяленні сельскага насельніцтва ў Сібір быў уключаны ў іх абавязкі. Сваё заключэнне па гэтым пытанні яны накіроўвалі ў губернскую прысутнасць. Нярэдка менавіта меркаванне земскага начальніка станавілася вызначальным пры рашэнні пытання аб выдачы пасведчання. Так адбылося ў выпадку селяніна Ігуменскага павета В. Кавалевіча, які звярнуўся ў 1902 г. з просьбай аб выдачы яму прахаднога пасведчання для перасялення ў Томскую губерню на імя мінскага губернатара. Селянін ужо звяртаўся з падобнай просьбай у 1899 г. і атрымаў адмову з прычыны адсутнасці неабходных для гэтага сродкаў. Тым не менш В. Кавалевіч атрымаў пашпарт і адправіўся на заробкі ў Сібір самавольна, дзе і застаўся пражываць. Земскі начальнік 1-га ўчастка Ігуменскага павета накіраваў сваё заключэнне ў Мінскую губернскую прысутнасць, у якім адзначыў, што не лічыць неабходным выдаваць селяніну прахадное пасведчанне, паколькі ён самавольна перасяліўся ў Сібір і хацеў узаконіць гэтае перасяленне. Мінская губернская прысутнасць не выдала селяніну дакументы [4, арк. 68–73].

Земскія начальнікі павінны былі звяртаць увагу на маёмаснае становішча сям'і, высвятляць згоду бацькоў пры хадайніцтве неаддзеленых сыноў. У выпадку хадайніцтваў аб перасяленні на Каўказ ім неабходна было пазначаць веравызнанне, мову і здольнасці сялян да агародніцтва, садоўніцтва і распрацоўкі непрыдатных надзелаў зямлі. Пры прадастаўленні хадайніцтваў аб перасяленні ў Прыамурскі край земскім начальнікам неабходна было збіраць звесткі аб тым, ці займаюцца сяляне рамёствамі або промысламі, хадайнічае аб перасяленні ўся сям'я або яе частка, высвятляць згоду на перасяленне членаў сям'і, якія дасягнулі паўналецця [2, арк. 159]. Гэтыя звесткі ўлічваліся пры выдачы прахадных пасведчанняў і пасведчанняў хадака.

Асаблівую ўвагу пры выдачы сведчанняў неабходна было надаваць «самавольцам», паколькі ўрад не заахвочваў спробы самавольнага перасялення сялян [5, с. 52]. Па прычыне частых выпадкаў самавольнага перасялення ў Сібір мясцовыя ўлады змянілі парадак выдачы пасведчанняў. У прыватнасці, мінскі губернатар аддаў распараджэнне земскім начальнікам

не выдаваць пасведчанні на перасяленне сем'яў і пасылку хадакоў у Прыамурскі край, а накіроўваць хадайніцтвы для далейшага разгляду ў губернскую прысутнасць. Пры гэтым земскія начальнікі павінны былі ўказваць, ці маглі гэтыя сем'і прадаць сваю маёмасць на суму ад 300 руб. На думку ўладаў, менавіта такая сума была неабходна для пабудовы дома на новым месцы [2, арк. 68].

Аднак «Часовыя правілы аб добраахвотным перасяленні сельскіх абывацеляў і мяшчан земляробаў на казённыя землі» ад 6 чэрвеня 1904 г. і Найвышэйшае зацверджанае палажэнне Савета міністраў «Аб парадку прымянення ў 1906 годзе закона ад 6 чэрвеня 1904 г. аб перасяленні сельскіх абывацеляў» змянілі сітуацыю [6, с. 603]. Згодна з Часовымі правіламі сяляне-перасяленцы атрымалі льготы, у тым ліку вызваленне ад казённых і мірскіх збораў тэрмінам на пяць гадоў, ільготны тарыф для праезду на чыгуначным транспарце, адтэрміноўку ад воінскай павіннасці тэрмінам на тры гады. Асноўнай умовай для перасялення сялян згодна з Палажэннем з'яўлялася толькі адпраўка хадакоў для замацавання за імі зямельнага ўчастка незалежна ад іх маёмаснага становішча [6, с. 603–607].

Такім чынам, на земскіх начальнікаў былі ўскладзены дадатковыя паўнамоцтвы па кантролі і наглядзе за перасяленнем сялян на малазаселеныя тэрыторыі Расійскай імперыі. У іх абавязкі ўваходзіў збор падрабязных звестак і перадача іх са сваім заключэннем у губернскую прысутнасць для прыняцця рашэнняў. Акрамя таго, мясцовыя органы ўлады павінны былі дэталёва растлумачваць сялянам наступствы прынятага рашэння аб перасяленні, а таксама не дапускаць самавольнага перасялення.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Каханоўскі А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2013. 333 с.

2. Циркуляры минского губернатора уездным земским начальникам и исправникам об усилении надзора и доставлении сведений о переселенцах и их семьях для разрешения ходатайств о переселении и о неповиновении крестьян помещикам // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 166.

3. Сведения о размере переселенческого движения по Минской губернии за 1901–1903 гг. // НГАБ. Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 120.

4. Переписка с земскими начальниками Минской губернии по ходатайствам крестьян о переселении в Сибирь. Посемейные списки крестьян // НГАБ. Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 176.

5. *Верещагин П. Д.* Крестьянские переселения из Белоруссии: вторая половина XIX века. Минск: Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1978. 144 с.

6. Высочайше утвержденные Временные правила о добровольном переселении сельских обывателей и мещан земледельцев на казенные земли: 6 июня 1904 г., № 24701 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3: в 33 т. СПб., 1907. Т. 14. С. 603–607.